# РАТУЮЧЫ ПРЫРОДУ, ДАПАМАГАЕМ ДУШЫ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Выстаўка — гэта вынік работы, якая доўжылася амаль паўтара года. Гэта — 11 стэндаў, якія паступальна расказваюць пра тое, чаму адной з частак жыцця кожнага чалавека павінна стаць уважлівае стаўленне да прыроды. Інфармацыйныя стэнды падрыхтаваны на двух мовах: па-беларуску і па-руску.

«Гэтая выстаўка — элементарны інструмент для святароў і выкладчыкаў агульнаадукацыйных і нядзельных школ, для кіраўнікоў маладзёжных брацтваў і ўсіх ахвотных казаць пра ашчаднае стаўленне да тварэння, — тлумачыць куратар праекта Сяргей Юшкевіч, які ўзначальвае кірунак «Царква і навакольнае асяроддзе» Цэнтра экалагічных рашэнняў. — Выстаўка аўтаномная, яе можна як вывучыць самастойна, так і праводзіць па ёй экскурсію».



Сяргей ЮШКЕВІЧ праводзіць экскурсію па выстаўцы.

Плануецца, што выстаўка будзе размяшчацца ў каталіцкіх парафіях і праваслаўных прыходах. Але, па вялікім рахунку, яна можа быць карысная для любой арганізацыі. Адзін з самых яркіх, і, мабыць, ключавых стэндаў прысвечаны таму, якім чынам царкоўная супольнасць або любая іншая можа стаць экалагічна дружалюбнай. Напрыклад, можна зрабіць насценгазету на тэму беражлівых адносін да прыроды, зладзіць кінакекторый, асобна збіраць смецце, не прыносіць штучныя кветкі на могілкі і не выкарыстоўваць пластыкавыя налепкі для ўпрыгожвання велікодных яек.

«Сучасны свет сутыкаецца з многімі крызісамі. Адным з самых небяспечных з іх з'яўляецца экалагічны, — лічыць архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі. — Касцёл заўсёды клапоціцца аб захаванні прыроды, ведаючы пра тое, што Бог стварыў гэты свет, і тады ўсё было добра. Ён благаславіў чалавека і даў яму ўладу над гэтым светам. Даў уладу, але не даў ва ўласнасць гэты свет. Калі мы даём пакарыстацца камусьці камп'ютарам ці кнігай, то спадзяёмся, што іх вернуць у тым жа стане, што мы аддавалі, а не разаб'юць ці запэцкаюць. На жаль, сучасны чалавек так робіць з прыродай: карыстаецца прыроднымі рэсурсамі, каб разбагацець, і не думае, што будзе далей. За раз таксама ёсць небяспека, што навакольнае асяроддзе можа не аднавіцца. А гэта ж наш клопат і адказнасць».

Па словах айца Іаана Ляшчанкі, члена рабочай групы Беларускай праваслаўнай царквы па рэалізацыі Праграмы супрацоўніцтва паміж БПЦ і Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у дні царкоўных свят мы выкарыстоўваем шмат неэкалагічных атрыбутаў, пластыку. Напрыклад, на Вербную нядзелю галінкі для асвячэння ўпрыгожваюць пластыкавымі кветкамі. «Ёсць Радаўніца, калі могілкі з месца цішыні і малітвы ператвараюцца ў нейкі кітч, дзе занадта яркія па колеры пластыкавыя кветкі не даюць магчымасці задумацца пра вечнасць і блізкіх. Адмовіцца ад пластыку ў прыходзе можа кожны! — упэўнены святар. — Калі вельмі хочацца, то вербачкі можна ўпрыгожыць папяровымі кветкамі, а на могілкі прынесці жывыя. Таксама лепш адмовіцца ад набыцця ў паломніцтвах святыняў у выглядзе маленькіх папяровых абразоў, бо надалей невядома, што з гэтым рабіць. Можна ж неяк па-іншаму захаваць успамін пра святыя мясціны, пакінуць памяць аб малітве, ахвяраваць на манастыр. Мы заклікаем адзін аднаго да ўмеранасці, да ўмення харчавацца хлебам надзённым. Кожны з нас можа гаварыць пра гэта на сваім месцы, у сваім прыходзе».

На працягу двух гадоў выстаўка «Чалавек і стварэнне» будзе экспанавацца ў розных епархіях Беларусі. Таксама яе можна самастойна замовіць у свой прыход, школу або любую іншую ўстанову бясплатна. Кірунак «Царква і ахова навакольнага асяроддзя» заклікае ўсіх ахвотных прымаць пасільны ўдзел у развіцці царкоўна-экалагічнага руху ў Беларусі. «Калі вы хочаце арганізаваць царкоўна-экалагічнае мерапрыемства ў прыходзе, але не ведаеце, з чаго пачаць, мы будзем рады дапамагчы вам», — заклікаюць арганізатары на адным са стэндаў. Калі ў вас з'явілася такое жаданне, вы можаце звязацца з імі па электроннай пошце e-mail: ecotvorenie@gmail.com або тэлефоне 375-29-252-71-45. Калі яшчэ маеце сумневы, то можаце паглядзець выстаўку ў электронным варыянце на сайце http://tvorenie.by/ у раздзеле «Ініцыятывы».

**Вераніка ПУСТАВІТ.**



Духавенства таксама зацікавілася падзеяй.

■ Крокі да Шагала

# ПАМЯЦІ АХВЯР ХАЛАКОСТУ

**У віцебскім Музеі Марка Шагала можна ўбачыць графіку Меера Аксельрода. Яго пры жыцці, як і Шагала, крытыкавалі, доўгі час мастак не быў зразумелы сучаснікамі. Супрацоўнічаў з рэжысёрам Сяргеем Эйзенштэйнам, сябраваў з паэтам і перакладчыкам Арсеніем Таркоўскім, іншымі вядомымі творчымі асобамі.**

**Ізраільскі мастацтвазнаўца, калекцыянер Ілья Васільеў** адзначае, што раней выстаўка «Нямецкая акупацыя ў графіцы Меера Аксельрода» не экспанавалася, беларусы яе ўбачаць першымі ў свеце. Аўтар, дарэчы, нарадзіўся ў Маладзечне — у 1902 годзе. Ізраільска-беларускі праект — пачатак «вяртання імя» Аксельрода на яго Радзіму.

Як трапна заўважыла **дырэктар шагалаўскага музея Ірына Воранава**, у гэтым пытанні ні маладзечанскія калегі паўтораць шлях віцебскіх. Трэба многае зрабіць, каб у Маладзечне, як і ў родным горадзе Шагала, з'явілася тое, што нагадвае пра знакамітасць. Каб туды таксама прыязджалі аматары творчасці. А для гэтага неабходны экспанаты, арганізацыя музея.



Фота Аляксея СПАТКАЙ.

Графіка, якая экспануецца ў Віцебску, мае свае асаблівасці. Яна выканана ў тым ліку і на абрыўках, бланках, газетах. Пісаў мастак і з двух бакоў. Гэта — з-за дэфіцыту паперы падчас эвакуацыі. Мы бачым яго вачыма папялішчы, руіны, няшчасных людзей, у якіх адна перспектыва — смерць. Хоць мастак не жыў на акупаваных тэрыторыях, але ж праз сэрца прапускаў усе жахі, боль тых, каго забівалі, гвалтавалі, з каго здзекаваліся ў гета. І яшчэ падчас Вялікай Айчыннай, калі невядома было, чым яна скончыцца, пачаў рабіць замалёўкі...

...У Аксельрода было нялёгкае жыццё. Яго творчы шлях да вядомасці вельмі складаны. У прыватнасці, у 1930-я разам з мноствам вядомых мастакоў трапіў пад прэс крытыкі, яго абвінавачвалі ў фармалізме. Пры гэтым у 1934 годзе яго карціны выстаўляліся ў Францыі. Што толькі не друкавалі пра мастака савецкія газеты! Напрыклад, ён атрымаў «па поўнай» за: песімізм, дэфармацыю, няскончанасць, экспрэсіянізм. Крытыкавалі і за блізкасць творчых падыходаў да Мадыльяні.

У выніку наш зямляк быў вымушаны заняцца ілюстрацыяй кніг і работай у тэатры. Зрабіў творчы ўклад і ў кінематограф. Асабіста Сяргей Эйзенштэйн запрасіў яго ў Алма-Ату для стварэння дэкарацый да фільма «Іван Грозны».

Як напісаў пра мастака Арсеній Таркоўскі: «Гэта выдатны прыклад таго, як выгадна быць сумленным і чыстым чалавекам... Вы бачыце зусім наглядна, які выдатны плён гэта прыносіць, як дорага тое, што робіцца людзьмі такога роду, якія з сапраўды святой упартасцю, з жалезнай воляй прабіваюцца скрозь усе перашкоды».

Творчае прызнанне мастак атрымаў, як гэта часта здараецца, пасля смерці (памёр у 1970-м). Персанальныя выстаўкі адбываліся ў 1970—1980-х — у Маскве, Ленінградзе. А ў 1990—2000 гадах зноў у Маскве, Нью-Ёрку, Лондане, Германіі, Ізраілі....

Творы Меера Аксельрода захоўваюцца ў Траццякоўскай галерэі, Рускім музеі, музеі выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна. Як адзначылі на прэзентацыі выстаўкі, ёсць яны і ў нашым Нацыянальным мастацкім музеі.

Выстаўку прэзентавалі напярэдадні Міжнароднага дня памяці ахвяр халакосту. Пасля Віцебска яе запланавана прадставіць у музеях Расіі, Германіі, Ізраіля, іншых краін.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ** ■

■ Сталіца

## Карэта Папялушкі, копія Эйфелевай вежы і заплыў дэльфінаў

У Мінску адкрыўся «Парк чароўных ліхтароў»

**Шоу светлавых інсталяцый зроблена па прыкладзе кітайскага аналага. Дарэчы, і сам праект рэалізаваны пра падтрымцы партнёраў з акругі Юаньчжоў. Парк раскінуўся па тэрыторыі «Дрымлэнда», пабываць там можна пасля 16.30 і да 23.30 штодня.**

Плануецца, што ў такім фармаце выстава будзе працаваць да мая, пасля чаго не закрыецца, а, наадварот, падоўжыць час наведвання да дзвюх гадзін ночы. Да таго ж, у цёплую пару года на тэрыторыі парку з'явяцца пункты з вулічнай ежай. Усяго ж наведвальнікі змогуць убачыць 40 кампазіцый, сярод якіх светлавы калідор, карэта Папялушкі, Эйфелева вежа, закаханая пара, розныя жывёлы: дэльфіны, жырафы, мядзведзі і многае іншае. Дарэчы, у сярэдзіне студзеня стала вядома, што сам парк забаў «Дрымлэнд» выстаўлены на таргі. У 2016 годзе кампанію, якой ён належыць, прызналі эканамічна неплацежаздольнай. Стартавы кошт продажу парку — 29,1 млн руб. Да гэтага яго ўжо выстаўлялі на таргі, але ахвотных яго набыць не знайшлося.

**Дар'я КАСКО** ■

## ЧАС ШЫШАК

**У лясгасах Беларусі вядзецца нарыхтоўка шышак елкі і сасны. У гэтым сезоне (з восені мінулага года да сёлетняй вясны) плануецца нарыхтаваць 521,5 тоны шышак і атрымаць больш за 6000 кілаграмаў насення, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Традыцыйна асноўную долю ад агульнага аб'ёму складзе насенне сасны звычайнай — 4900 кілаграмаў. Акрамя таго, будзе нарыхтавана 1100 кілаграмаў насення елкі еўрапейскай і 10 кілаграмаў насення лістоўніцы еўрапейскай.

У міністэрстве адзначылі, што ў лясгасах Беларусі шышкі збіраюць на спецыяльных плантацыях, дзе растуць сосны, елкі, піхты з палепшанымі якасцямі. На дадзены момант ужо нарыхтавана больш за 263 тоны шышак, каля 81 тоны паступіла на перапрацоўку ў лесанасенныя цэхі. Частка сыравіны ўжо перапрацаваная, астатні ўраджай пакуль знаходзіцца на захоўванні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**